

# СЛОВА ЖЫЦЦЯ

Снежань 2014




"Хто мае дзве вопраткі, няхай аддасць таму,
хто не мае, і хто мае ежу,
няхай зробіць тое самае"
*(Лк 3,11).*



**Падчас Адвэнту, які рыхтуе нас да свята Божага Нараджэння, мы звяртаемся да постаці святога Яна Хрысціцеля. Ён быў пасланы Богам, каб падрыхтаваць шляхі для прышэсця Месіі.**



**Ад тых, хто пайшоў за ім, ён запатрабаваў глыбокай перамены жыцця: "Прынясіце ж годны плён пакаяння"** *(Лк 3,8).* **А для тых, хто спытаўся: "Што ж нам зрабіць?"** *(Лк 3,10)* **адказаў:**





"Хто мае дзве вопраткі, няхай аддасць таму,
хто не мае, і хто мае ежу,
няхай зробіць тое самае"
*(Лк 3,11).*

Чаму я павінен аддаць некаму тое, што маё? З рэшты таму, што гэтак жа як і мяне, яго стварыў Бог, і гэта мой брат, мая сястра, і таму - частка мяне.



**Гандзі казаў: "Я не магу пакрыўдзіць цябе, не пакрыўдзіўшы сябе самога."** *(гл. Wilhelm Mühs, Parole del cuore, Milano 1996, s. 82).*





Мы былі створаны як дар для іншых,
як вобраз і падабенства Бога, які ёсць любоўю.
Мы маем ў сваёй крыві закон Божай любові.

**Езус, прыйшоўшы да нас, выразна паказаў і даў нам новую запаведзь: "Любіце адзін аднаго, як Я палюбіў вас»** *(Ян 13,34).*



Гэта "закон Неба", гэта жыццё Святой Троіцы, перанесенае сюды, на зямлю, гэта самае сэрца Евангелля.



**Як на Небе Айцец, Сын і Дух Святы жывуць у поўнай еднасці, становячыся адным** *(Ян 17,11)*, **так і мы на зямлі ёсць сапраўднымі на столькі ж, на сколькі жывем узаемнаю любоўю.**






**Як Сын кажа Айцу: "Ўсё Маё - гэта Тваё, і Тваё - гэта Маё"**
*(Ян 17,10)*, **гэтак жа і паміж намі, любоў рэалізуецца ў поўні там, дзе мы дзелімся не толькі духоўнымі дабротамі, але і матэрыяльнымі.**

Патрэбы аднаго з нашых бліжніх ёсць патрэбамі ўсіх. Нехта безпрацоўны? Я таксама.



У кагосці захворэла мама? Дапамагаю, як бы гэта была мая мама. Нехта галодны? То гэта так, як быццам галодны я сам, і я буду клапаціцца пра ежу для яго, як для сябе.





**Вось досвед першых хрысціянаў у Ерусаліме:**
**“Усе , хто паверыў, былі адзіныя сэрцам і душою, і ніхто не называў уласным нічога з маёмасці сваёй, якая належала яму, але ўсё ў іх было супольнае.”** *(Дз 4,32).*
**Супольнасць дабротаў, хоць яна і не была абавязковай, была моцна ўкаранёная сярод іх.**

**Як тлумачыў святы Апостал Павел, “не пра тое гаворка, каб вы рабілі палёгку іншым, а сябе пакідалі ва ўціску, але каб была роўнасць.”** *(2Кар 8,13).*



**Св. Васіль Кесарыйскі кажа: "Галоднаму прызначаны хлеб, які ты адклаў на запас; голаму - паліто, якое ты хаваеш у сваім куфры, патрабуючым - грошы, якія схаваў"** *(Aforismi e citazioni cristiane, Piemme, 1994, c. 44).*



**А св. Аўгустын: "Тое, што ёсць лішкам багатых, належыць бедным." "Апроч таго, бедныя могуць дапамагаць адзін аднаму: адзін можа пазычыць свае ногі кульгаваму, іншы свае вочы - сляпому, а яшчэ нехта можа наведаць хворых"** *(там жа, с. 45.)*







**"Хто мае дзве вопраткі, няхай аддасць таму,**
**хто не мае, і хто мае ежу,**
**няхай зробіць тое самае"**
*(Лк 3,11).*

Нават сёння мы можам жыць, як першыя хрысціяне.

Евангелле гэта не ўтопія.



Доказам гэтага з'яўляюцца новыя рэлігійныя рухі, якія Дух Святы ўтварыў у касцёле, каб адрадзіць, абнавіць эвангельскі радыкалізм першых хрысціян і каб адказаць на галоўныя выклікі сучаснага грамадства, у якім існуе так шмат несправядлівасці і беднасці.





**Я памятаю пачатак руху Факаляраў, калі новая харызма ўзбуджала ў нашых сэрцах асаблівую любоў да бедных. Калі мы сустракалі іх на сваім шляху, мы запісвалі іхныя адрасы ў сшытку, каб потым прыйсці да іх з дапамогай; мы былі Езусам: "тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі"** *(Мц 25,40).*

Мы наведвалі іх у трушчобах, запрашалі на вячэру ў нашыя дамы. Для іх былі: самыя прыгожыя абрусы, найлепшыя сталовыя прыборы, лепшыя стравы. Каля нашага стала, у першым факаляры, сядзелі так: факалярына, бедны, факалярына, бедны...





У пэўным моманце нам здалося, што Бог папрасіў менавіта нас, каб сталіся беднымі, каб служылі бедным, усім. Тады, на сярэдзіне пакоя ў першым факалярах кожная з нас палажыла тое, што, як яна лічыла, было ў яе ў лішку: паліто, пальчаткі, шапку, нават шубу...







А сёння, каб дапамагаць бедным, у нас ёсць нават прадпрыемствы, якія даюць ім працу, дзеляцца прыбыткам. Аднак, ёсць яшчэ шмат чаго, што можна зрабіць для бедных.







"Хто мае дзве вопраткі, няхай аддасць таму,
хто не мае, і хто мае ежу,
няхай зробіць тое самае"
*(Лк 3,11).*

У нас ёсць шмат багацця, каб некаму падарыць, нават калі вы гэтага не бачыце. Мы павінны абвастрыць нашу адчувальнасць, даведацца, каб дапамагаць канкрэтна, каб знайсці спосаб, як жыць братэрствам.



Мы маем у сэрцы пачуцці, каб іх ахвяраваць, дабрыню, каб яе праяўляць, радасць, каб ёю падзяліцца. Мы можам ахвяраваць час, малітву, можам падараваць унутранае багацце, у пісьмовай або вуснай форме; але таксама ў нас ёсць розныя рэчы для падарункаў: сумкі, ручкі, кнігі, грошы, дамы, аўтамабілі, каб некага перавезці...



А, магчыма, мы збіраем шмат рэчаў, думаючы, што калі-небудзь мы будзем мець у іх патрэбу, а між тым, побач з намі ёсць хтосьці, хто як раз мае ў іх тэрміновую патрэбу.



Як кожная расліна бярэ з глебы толькі неабходную колькасць вады, так і мы стараемся мець толькі тое, што сапраўды неабходна. Лепей часам убачыць, што нечага нам не хапае; лепей быць трохі бяднейшым, чым занадта багатым.



"Калі б мы ўсе задаволіліся тым, што неабходна, - казаў св. Базыль, - і аддалі лішак бедным, то не было б ані багатых, ані бедных."



Давайце паспрабуем, давайце пачнём так жыць. Напэўна, Езус дасць нам стокроць болей, і мы зможам аддаваць ізноў. І тады Ён скажа нам, што ўсё, што мы аддалі іншым, мы аддалі Яму.



"Хто мае дзве вопраткі,
няхай аддасць таму,
хто не мае, і хто мае ежу,
няхай зробіць тое самае".



Testo di Chiara Lubich, Pubblicata su Città Nuova 2003/22, p.7.

Grafica Anna LolloGrafica Anna Lollo in collaborazione con don Placido D'Omina (Sicilia, Italia)

* * *

Il commento alla Parola di Vita è tradotto ogni mese in 96 lingue e idiomi,
e raggiunge vari milioni di persone in tutto il mondo
tramite stampa, radio, TV e via internet.
Per informazioni www.focolare.org

.

Questo PPS, in diverse lingue, è pubblicato su www.santuariosancalogero.org